*А.В.Пастыка, аспірант*

# ДАЛУЧЭННЕ ШКОЛЬНІКА ДА ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ ВА ЎМОВАХ ДЗІЦЯЧЫХ БІБЛІЯТЭК

Патрабаванні, што прад’яўляюцца да асобы ва ўсіх сферах дзейнасці, – гэта нестандартнае мысленне, здольнасць ацэньваць сітуацыю і творча знаходзіць з яе выйсце. Для таго каб адпавядаць такім патрабаванням, вельмі важным для чалавека з’яўляецца засваенне духоўнай культуры.

Неабходнай умовай уздзеяння духоўнай культуры на асобу з’яўляецца “ўстанаўленне кантакту” паміж духоўнымі каштоўнасцямі і асобай. Яму садзейнічае шэраг грамадскіх інстытутаў, у тым ліку і дзіцячыя бібліятэкі Беларусі.

У працэсе развіцця духоўнай культуры, як лічыць Л.С.Франк, існуюць традыцыя і інавацыя [2]. Прычым без інавацыі няма традыцыі, а без традыцыі няма інавацыі. Калі суаднесці гэтыя паняцці з дзейнасцю дзіцячых бібліятэк, то традыцыйнымі сродкамі далучэння да духоўнай культуры асобы чытача з’яўляюцца кніжныя багацці, аснову якіх у славянскім свеце распачалі першаасветнікі Кірыл і Мяфодзій, а інавацыйнымі – масівы электронных сродкаў інфармацыі, што атрымалі шырокае распаўсюджванне ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст.

Таму на сёння адным з асноўных кірункаў дзейнасці дзіцячых бібліятэк з’яўляецца фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў, як традыцыйных, так і электронных.

Кніжныя і электронныя носьбіты інфармацыі ствараюць такія ўмовы, калі чытач можа хутка і якасна атрымаць неабходную для сябе інфармацыю. Разумовы баланс друкаваных і камп’ютэрных сродкаў дае падставу дзіцячым бібліятэкам Беларусі быць мабільнымі, хутка рэагаваць на змены ў грамадстве і задавальняць патрэбы чытачоў.

Калі перанесці прынцып суадносін традыцыі і інавацыі ў маштабы сусвету, то размова будзе ісці аб суадносінах кніжнай і віртуальнай культур. У тым, што кніжная культура з’яўляецца састаўной часткай культуры духоўнай, ні ў каго не выклікае сумненняў. А вось ці з’яўляецца часткай духоўнай культуры віртуальная інфармацыйная культура? Сучасныя ж даследчыкі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

адносяць да духоўнай культуры ўсе формы і віды актыўнасці, якія функцыянальна звязаны з развіццём грамадскай свядомасці [2].

Віртуальная інфармацыйная культура ўзнікла на падставе кніжнай культуры, а яна, у сваю чаргу, стала традыцыяй, калі з’явіліся электронныя носьбіты інфармацыі, камп’ютэрныя глабальныя сеткі.

Аднак і кніжная, і віртуальная інфармацыйная культура, як адзначаў У.Эко, створана на тым, што было адкрыта стагоддзі таму назад, на тым, што прынеслі на славянскую зямлю Кірыл і Мяфодзій, – на алфавіце. Такім чынам, і друкаваны тэкст, і дысплей камп’ютэра, на якім змешчана пэўная інфармацыя, – толькі формы, якія змяняюцца са зменамі ў тэмпах развіцця матэрыяльнай культуры.

Асоба робіць выбар са сродкаў, якія транслiруюць шырокі спектр рознабаковай інфармацыі ў чытальных залах бібліятэк і мультымедыйных цэнтрах. Выбар можа быць абумоўлены індывідуальнымі здольнасцямі і адукацыйнымі патрэбамі, настроем і рухам душы. Кола тэм, формаў, сродкаў і метадаў работы тут даволі цікавае і шырокае. На наш погляд, эфектыўнай з’яўляецца праграмная дзейнасць, якая прадугле-   джвае планамернае і сістэматычнае ўзаемадзеянне з асобай, што ў сваю чаргу садзейнічае яе фарміраванню і развіццю.Трэба адзначыць, што такі спосаб дзейнасці з кожным годам выбірае для сябе ўсё большая колькасць дзіцячых бібліятэк. Яны распрацоўваюць арыгінальныя праграмы, напрыклад “Чытанне – частка духоўнай культуры” (філіял № 2 ЦСДБ г. Мінска), “Свет праз культуру” (ЦГДБ г. Мінска). Прымаюць удзел у розных праграмах некаторыя цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы. Гэта, напрыклад, такія праграмы, як “Датуль завемся мы народам, пакуль шануем карані” (Асіповіцкая ЦБС), “Духоўна-прававое выхаванне” (Мінская ЦБС), “Каб душу сагрэў духоўнасці свет” (Быхаўская ЦБС). Дзіцячыя бібліятэкі з’яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі і дзяржаўных праграм. Так, у межах рэалізацыі рэспубліканскай “Праграмы супрацоўніцтва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквы ў галіне культуры і творчай дзейнасці, аховы, аднаўлення і развіцця гістарычнай і культурнай спадчыны” ў Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы г. Гродна пачалі ствараць фонд праваслаўнай літаратуры [1]. Аформлена выстава дзіцячай літаратуры “Духоўныя пасевы”.

Намі быў праведзены аналіз чытацкіх фармуляраў навучэнцаў 5–6 класаў дзіцячага аддзялення Брэсцкай абласной бібліятэкі імя

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

М. Горкага. Была выяўлена вялікая цікавасць чытачоў да кніг аб Ефрасінні Полацкай, Францыску Скарыне і іншых асветніках, дзіцячай Бібліі і іншых выданняў рэлігійна-духоўнага зместу, літаратуры па гісторыі і культуры свайго горада і краіны, казак, легенд і паданняў, з якіх дайшло да нас мудрае слова продкаў. Але ж пры апытанні рэспандэнтаў было высветлена, што матывамі, якія прымусілі іх звярнуцца да літаратуры пэўнай тэматыкі, у асноўным з'яўляюцца заданні па школьнай праграме. І тое, што чытачы часцей звяртаюцца да літаратуры духоўнага складу па прынцыпе "неабходна для задавальнення адукацыйных патрэб", а не "неабходна для душы", можа быць прычынай, што ім цяжка ўспрымаць атрыманую інфармацыю.

Асноўная задача дзіцячай бібліятэкі – абудзіць душу дзіцяці. Неабходна выяўляць і задавальняць інтарэсы дзіцяці праз бібліятэчна-бібліяграфічныя сродкі, каб чытач не толькі творча падыходзіў да свайго асабістага жыцця, але і мог адчуваць другога, суперажываць яму, выказваць спагаду, дабрыню, міласэрнасць. Трэба адзначыць, што гэтаму прысвечаны многія мерапрыемствы ў дзіцячых бібліятэках Беларусі. Сярод іх праграмы "Бібліятэка і міласэрнасць" (філіял № 14 г. Мінска); "Крыніца духоўнасці" (Круглянская ЦБС), "Міласэрнасць" (ЦГДБ імя А.С. Пушкіна, г. Брэст); акцыі міласэрнасці, акцыі-пошукі "Ветэраны жывуць побач" (бібліятэкі Магілёўскай вобласці); дэкады "Планета міласэрнасці" (Бабруйская ЦРБ); дні добрых паслуг (Кіраўская ЦБ). Увагі заслугоўвае супрацоўніцтва калектываў і чытачоў дзіцячых бібліятэк з дзецьмі з абмежаванымі магчымасцямі, для якіх у філіяле № 5 ЦСДБ г. Мінска праведзена сустрэча з паэтамі-інвалідамі пад назвай "Урок жыцця – пераадольванне".

Такім чынам, дзейнасць дзіцячых бібліятэк Беларусі па далучэнні да духоўнай культуры школьнікаў дае падставу сцвярджаць, што імі робіцца пэўны ўклад у фарміраванне і развіццё асобы школьніка з цвёрдымі маральна-духоўнымі прынцыпамі, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, здольнай павялічваць каштоўнасці духоўнай культуры Беларусі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

1. *Бібліятэкі* Гродзеншчыны: агляд дзейнасці публічных бібліятэк вобласці за 2004 год / ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага". – Гродна, 2005. – С. 16–19.

2. *Культурология.* XX век: энциклопедия. – СПб.: Университетская книга, 1991. – Т. 1. – С. 346–347.

3. *Публічныя* бібліятэкі Магілёўшчыны: здабыткі 2004 года: аналітычная даведка, статыстычныя паказчыкі работы / УК "Магілёўская абласная бібліятэка імя У.І.Леніна". – Магілёў, 2005.

4. *Тлумачальная* запіска да статыстычнай справаздачы 6 – НК аб рабоце дзіцячых бібліятэк Брэсцкай ЦБС за 2004 год. – Брэст, 2005. – 8 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ